**К. Станкевіч**

# ПРАЯВЫ НЕТРАДЫЦЫЙНАЙ РЭЛІГІЙНАСЦІ Ў ГОМЕЛІ Ў ПЕРЫЯД З 1991 ДА 1994 ГОДА

Крызісныя падзеі канца 1980-х – пачатку 1990-х гг. парушылі звыклыя арыенціры духоўнага свету савецкіх людзей. Ім патрэбна была падтрымка ў справе адаптацыі да новых рэаліяў. У тых гістарычных умовах найлепш з гэтай задачай спраўлялася рэлігія, таму ў 1992 г. пачалася масавая рэгістрацыя праваслаўных, каталіцкіх, пратэстанцкіх і іншых прыходаў.

Асноўнай мэтай майго даследвання стаў аналіз нетрадыцыйных рэлігій, а таксама дзейнасці шматлікіх чараўнікоў, лекараў і прапаведнікаў, даволі распаўсюджаных на тэрыторыі рэспублікі падчас пераходнага перыяду з 1991 па 1994 год. Галоўная праблема – супярэчлівасць законнасці пералічаных арганізацый і асоб. Дэталёвы разгляд падзей ажыццяўляўся на аснове падыхода “oral history” і матэрыялаў СМІ. Даследванне было звужана да межаў г. Гомеля. У якасці крыніц былі выкарыстаны нумары газет “Гомельская праўда” і “Гомельскія ведамасці” за 1991–1994 гг., артыкулы з інтэрнэт-выданняў, а таксама навуковыя артыкулы і манаграфіі. Таксама быў апытаны сведка, чый сябар у 90-я гады трапіў у секту.

У выніку праведзенага даследавання сфармуляваны наступныя высновы. 1. На тэрыторыі Гомеля з нетрадыцыйных рэлігій найбольш распаўсюджанымі былі так званыя неакульты і неапратэстанцкія рэлігійныя плыні (“пяцідзя-

сятнікі”): хрысціяне веры евангельскай (ХВЕ), хрысціяне веры апостальскай і хрысціяне поўнага Евангелля. У 1990-х гг. ХВЕ мелі адзін з самых высокіх паказчыкаў прыросту новых адэптаў і сталі трэцяй (пасля БПЦ і РКЦ). У агульным па рэспубліцы колькасць суполак у 1991–1994 гг. павялічылася на 69. 2. Афіцыйную рэгістрацыю з ліку арганізацый новых рэлігійных аб’яднанняў у Рэспубліцы Беларусь з пачатку 1990-х гг. займелі Ба-Хаі і крышнаіты, або вайшнавы. 3. Дзейнасць пералічаных арганізацый, а таксама чараўнікоў, лекараў і г.д. актыўна прапагандавалася ў СМІ.

Такім чынам, у Гомелі, як і ў Беларусі ў цэлым, у пачатку 1990-х гг. сфармаваўся феномен “рэлігійна-царкоўнага рэнесансу”. З’яўленне і развіццё на постсавецкай прасторы нетрадыцыйных рэлігій, неакультаў і дзялкоў, што карысталіся любой магчымасцю зарабіць грошы, было звязана з разбурэннем звыклага ўкладу жыцця, працэсамі глабалізацыі ў сферы духоўнай культуры і з недастаткова высокай рэлігійнай адукаванасцю насельніцтва. “Рэлігійна-царкоўны рэнесанс” адбываўся ва ўмовах з'яўлення “моды” на рэлігію сярод насельніцтва, успрымальнай да ідэі звышнатуральнага. Аднак пры гэтым ацэнкі рэальнай рэлігійнасці грамадства носяць супярэчлівы характар. Найбольш значнай праявай “рэлігійна-царкоўнага рэнесансу” стала менавіта колькаснае павелічэнне рэлігійных арганізацый.